Выбары-2019

ПАДЗЕЯ, ЯКАЯ ДАТЫЧЫЦЦА КОЖНАГА

Першая місія міжнародных наглядальнікаў будзе акрэдытавана ЦВК 4 верасня

Яна прадстаўлена Выканаўчым камітэтам Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Пра гэта расказала журналістам старшыня Цэнтрвыбаркама Лідзія ЯРМОШЫНА перад пачаткам семінара Грамадскага аб'яднання «Белая Русь».

Лідзія Ярмошына адзначыла, што ўжо запланавана яе сустрэча з кіраўніком Выканкама СНД Сяргеем Лебедзевым, падчас якой будуць уручаны першыя пасведчанні наглядальнікаў.

У Міністэрства замежных спраў Беларусі паступілі паведамленні аб жаданні прыехаць у нашу краіну місіі па ацэнцы патрэб з боку БДІПЧ АБСЕ. Гэта пакуль прадстаўнікі тэхнічнага персаналу, якія будуць вызначаць умовы правядзення выбараў у нашай краіне.

Па словах Лідзіі Ярмошынай, у ЦВК паступілі першыя скаргі, напрыклад ад Беларускага Хельсінскага Камітэта — аб пацвярджэнні канстытуцыйнасці ўказаў аб назначэнні выбараў. Ёсць звароты ад грамадзян, якія плануюць балатавацца, з просьбай патлумачыць ім закон.

Выбары ў Палату прадстаўнікоў прызначылі на 10 месяцаў раней за апошні магчымы тэрмін, на 17 лістапада 2019 года. У іншым выпадку яны супалі б у будучым годзе з абраннем Прэзідэнта Беларусі. І ў парламента, і ў кіраўніка краіны адначасова заканчваюцца тэрміны паўнамоцтваў, але ніколі ў гісторыі Беларусі выбары Прэзідэнта не сумяшчаліся з іншымі.

«Белая Русь» услед за прафсаюзамі з'яўляецца другім па актыўнасці грамадскім аб'яднаннем, якое фарміруе выбарчыя камісіі. Не менш за траціну складу выбарчых камісій павінны складаць прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў, палітычных партый. Акрамя таго, «Белая Русь» традыцыйна актыўна ўдзельнічае ў вылучэнні кандыдатаў у дэпутаты і потым у агітацыі. «Я думаю, што гэта арганізацыя традыцыйна будзе іграць сваю вельмі вялікую ролю ў выбарах», — паведаміла старшыня ЦВК Беларусі.

Лідзія Ярмошына акцэнтавала ўвагу на тым, што не з'яўляецца членам гэтага грамадскага аб'яднання: была запрошана на мерапрыемства ў якасці дакладчыка і расказала пра асаблівасці, асноўныя этапы і правілы выбарчай кампаніі — 2019.

Па словах старшыні «Белай Русі» Генадзя Давыдзькі, арганізацыя плануе прапанаваць у кандыдаты амаль 80 сваіх членаў, сярод іх будзе і сам кіраўнік грамадскага аб'яднання.

«Белая Русь» сфарміравала прапановы па магчымых зменах выбарчага заканадаўства і разлічвае, што гэтую работу будуць ажыццяўляць выбраныя ў парламент прадстаўнікі арганізацыі.

Марыя ДАДАЛКА.

Надвор'е

АПОШНЯЯ ХВАЛЯ ДОБРАГА ЦЯПЛА

Да 31 градуса на фоне моцных ліўняў

Прырода сёлета шчодрая на сінаптычныя сюрпрызы. Не выключэннем стала і анамальнае павышэнне тэмпературы ў апошняй дэкадзе жніўня. Праўда, вяртанне спякоты будзе суправаджацца дажджамі, месцамі даволі моцнымі. Па звестках спецыялістаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды, вобласць павышанага атмасфернага ціску, якая так парадавала нас у мінулыя выхадныя добрым надвор'ем, саступае месца франтальнаму падзелу з паўднёвага захаду Еўропы.

А сёння ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Максімальная тэмпература паветра чакаецца ад плюс 22 да 28 градусаў, па паўднёвым усходзе краіны — да 29—31 цяпла.

У сераду пад уплывам маларухомага, кантрастнага і актыўнага атмасфернага фронту будзе больш аблокаў. Уначы месцамі, а ўдзень у многіх рэгіёнах краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, дзе-нідзе з навальніцамі, па паўночным захадзе чакаюцца моцныя дажджы. Вецер прагназуецца ўмераны пераменных напрамкаў, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 12 да 19 градусаў, удзень — ад 18 градусаў цяпла па паўночным захадзе да 31 градуса па паўднёвым усходзе краіны.

На наступны дзень чакаецца рост атмасфернага ціску, які адцясніць франтальны падзел на ўсход за межы краіны. Таму ў чацвер чакаецца пераменная воблачнасць. Уначы месцамі, а ўдзень толькі па паўднёвым усходзе краіны пройдуць невялікія кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Уначы і раніцай у нізінах магчымы туман. Тэмпература паветра ўначы стане камфортнай і складзе ад плюс 11 да 18 градусаў. Удзень будзе 18—24 цяпла, па крайнім паўднёвым усходзе Гомельскай вобласці — плюс 25—29 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пятніцу і выхадныя нас чакае цалкам добрае надвор'е, толькі ў ранішнія гадзіны будзе даволі свежа. Тэмпература паветра ўначы складзе 8—14 цяпла, а месцамі будзе нават апускацца да плюс 5—7 градусаў. А ўдзень сонца прыгрэе, зноў будзе да 20—26 цяпла. Бязветрана, спакойна і галоўнае — без ападкаў.

Сяргей КУРКАЧ.

Тэндэнцыі

Крэдыты дзелавым жанчынам за год выраслі ў два разы

Цэнтр падтрымкі і развіцця жаночага прадпрымальніцтва створаны ў Белінвестбанку

«У апошнія гады тэрмін «жаночае прадпрымальніцтва» не толькі трывала ўвайшоў у эканамічнае жыццё сусветнай супольнасці, але і стаў часткай беларускіх рэалій. На развіцці жаночага бізнесу сфакусаваная ўвага дзяржавы і грамадскіх арганізацый. Хто прапусціць гэтую тэндэнцыю, той прайграе», — лічыць начальнік Цэнтра падтрымкі і развіцця жаночага прадпрымальніцтва Белінвестбанка Вікторыя БАЙРАН.

«Як паказаў наш вопыт, асноўныя праблемы, з якімі сутыкаюцца бізнес-лэдзі, — недахоп ведаў у фінансавай сферы і адсутнасць сродкаў для пачатку і развіцця сваёй справы. Мы паставілі перад сабой задачу па меры сіл вырашаць гэтыя пытанні», — адзначыла Вікторыя Байран.

На сённяшні дзень жаночы бізнес — сусветны трэнд. Жанчыны складаюць амаль 54 % насельніцтва нашай краіны, або практычна палову занятых у эканоміцы. Больш за 37 % беларусак маюць вышэйшую адукацыю. Каля 30 % гэтых жанчын маюць уласны бізнес.

У структуры кліенцкай базы малога і сярэдняга бізнесу Белінвестбанка жаночы бізнес складае 36 % — гэта звыш 11 тысяч кліентаў. За апошні год (з ліпеня мінулага года да ліпеня цяперашняга) колькасць крэдытаў, якія выдаюцца суб'ектам жаночага прадпрымальніцтва, павялічылася амаль у два разы.

Сяргей КУРКАЧ.

ГАСЦІНІЦЫ, ВАКЗАЛ, АЭРАПОРТ...

Усё гэта ўчора «замініравалі» ў сталіцы

Цэнтральны (горада Мінска) раённы аддзел Следчага камітэта распачаў крымінальную справу па фактах заведама лжывых паведамленняў аб небяспецы, якія ўтрымлівалі інфармацыю аб мініраванні пяці гасцініц, чыгуначнага вакзала і Нацыянальнага аэрапорта Мінск. Пра гэта паведамляецца ў афіцыйным тэлеграм-канале СК.

Праваахоўныя органы прынялі меры па забеспячэнні бяспекі людзей: больш за дзве тысячы чалавек былі эвакуяваны. На месцы здарэнняў учора выбывалі сапёрна-піратэхнічныя і следча-аператыўныя групы. Ні на адным з аб'ектаў выбуховых прылад не выяўлена. Работа гасцініц, чыгуначнага вакзала і аэрапорта была адноўлена.

Цяпер праводзяцца следчыя дзеянні, сумесна з супрацоўнікамі міліцыі ўстанаўліваюцца абставіны здарэння. Акрамя таго, следчыя ў Магілёве, дзе месціцца кантакт-цэнтр БЧ, агледзелі рабочае месца спецыяліста, які атрымаў паведамленне аб мініраванні сталічнага чыгуначнага вакзала.

З пачатку года Следчым камітэтам заведзена 35 крымінальных спраў аб заведама непраўдзівых паведамленнях аб небяспецы. Пры іх расследаванні ўстаноўлены 14 чалавек, якія маюць дачыненне да падобных паведамленняў, а па шасці крымінальных справах ужо вынесеныя абвінаваўчыя прысуды.

За заведама лжывае паведамленне аб небяспецы прадугледжана крымінальная адказнасць, якая надыходзіць з 14 гадоў. Акрамя гэтага, пакрыццю падлягаюць сродкі, затрачаныя экстраннымі службамі на правядзенне спецыяльных дзеянняў і праверачных мерапрыемстваў, нагадваюць у СК.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Суд у Лондане абавязаў Нігерыю выплаціць брытанскай кампаніі дзевяць мільярдаў долараў — трэць дзяржбюджэту

Урад Нігерыі абавязаны выплаціць брытанскай кампаніі Process & Industrial Development Limited (P&ID) кампенсацыю ў памеры 9 мільярдаў долараў у якасці кампенсацыі за нявыкананы кантракт. Як перадае ТАСС, адпаведная пастанова прынята Высокім судом Лондана.

Адзначаецца, што гэтая сума складае адну трэць ад дзяржаўнага бюджэту краіны на гэты год.

Амаль дзесяць гадоў таму нігерыйскі ўрад падпісаў з інжынірынгавай і кіроўнай кампаніяй P&ID 20-гадовае пагадненне аб пастаўках і перапрацоўцы прыроднага газу. Аднак работы па ім практычна не ажыццяўляліся. Летам 2012 года брытанская кампанія падала іск у арбітражны суд Лондана. Праз пяць гадоў трыбунал вынес рашэнне на карысць P&ID, абавязаўшы Нігерыю выплаціць за невыкананне кантракту суму ў памеры 6,6 мільярда долараў.

Аднак нігерыйскі ўрад падаў апеляцыю ў Высокі суд Лондана з мэтай дабіцца перагляду гэтага рашэння трыбунала. Пасля разгляду справы суд пастанавіў пакінуць у сіле рашэнне арбітражнага трыбунала, налічыўшы пры гэтым да доўгу працэнты.

Трамп заявіў пра страту трох—пяці мільярдаў долараў з-за работы прэзідэнтам ЗША

Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп, выступаючы перад супрацоўнікамі нафтахімічнага прадпрыемства кампаніі Shell, размешчанага недалёка ад Пітсбурга, штат Пенсільванія, заявіў, што, займаючы гэтую пасаду, страціў да $5 млрд.

«Верагодна, гэта (знаходжанне на пасадзе прэзідэнта ЗША. — **«Зв».)** ужо каштавала мне ад $3 мільярдаў да $5 мільярдаў — і мне ўсё роўна. Вы ведаеце, калі вы багатыя, гэта не мае значэння. Я проста хачу рабіць выдатную работу», — цытуе Трампа NBC News.

Па словах кіраўніка амерыканскай дзяржавы, такія страты абумоўлены тым, што ён адмовіўся ад працягу кар'еры прадпрымальніка, а таксама «штодзённымі» судовымі працэсамі, бо яму рэгулярна даводзіцца траціцца на адвакатаў з-за пададзеных супраць яго іскаў. «Прэзідэнцкая пасада абыходзіцца мне ў цэлае багацце», — дадаў ён.

Пры гэтым Трамп заявіў, што, нягледзячы на гэта, мае намер перавыбірацца на пасаду прэзідэнта.

Як адзначае NBC, лічбы, якія назваў Трамп, практычна немагчыма праверыць, бо прэзідэнт не публікаваў свае падатковыя дэкларацыі, раней паабяцаўшы зрабіць гэта пасля сыходу з пасады. Акрамя таго, тэлеканал паведамляе, што Трампа раней выкрылі ў тым, што ён перабольшыў сваё багацце (Трамп заяўляў, што яго памер большы за $10 млрд).

Доўгажыхара можна вылічыць па валасах

З узростам знешнасць людзей змяняецца, і сівізна лічыцца адной з прыкмет старэння. Іспанскія вучоныя выявілі нечаканую сувязь паміж з'яўленнем сівых валасоў і працягласцю жыцця.

Спецыялісты з Мадрыда правялі некалькі даследаванняў, яны ўважліва вывучылі больш за пяць тысяч гісторый хвароб розных людзей ва ўзросце ад 30 да 60 гадоў і высветлілі, як звязаны колер валасоў з рызыкай заўчаснай смерці ад сур'ёзных захворванняў.

Для выпрацоўкі пігмента, які адказвае за колер валасоў, у арганізме чалавека павінна прысутнічаць рэчыва — глуатыён. Тое ж рэчыва неабходна для абароны арганізма ад сардэчна-сасудзістых і анкалагічных захворванняў, а таксама хваробы Альцгеймера. З узростам выраб гэтага рэчыва ў арганізме зніжаецца, а рызыка сур'ёзных хвароб, наадварот, узрастае. У рана пасівелых людзей глуатыён «расходуецца» не на выпрацоўку пігмента, а на абарону арганізма. Такім чынам, ранняя сівізна ўказвае на тое, што чалавек можа пражыць доўга.